■ Добрая навіна

6,1 млн рублёў за «квадрат»

Гэтымі днямі ў нашай краіне павялічыўся гранічны нарматыў кошт аднаго квадратнага метра жылля для атрымання льготнага крэдыту на нерухомасць — з 5,3 млн да 6,1 млн рублёў. Такія лічбы вызначаны пастановай Савета Міністраў №1191 ад 31 снежня 2013 года, якая апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Такім чынам, сёлета істотна павялічваюцца памеры льготных крэдытаў пад будаўніцтва жылля для чаргавікоў. У дакуменце гаворыцца аб вызначаным законам максімуме цэнніка квадратнага метра, які банк улічвае пры разліку максімальнага памеру льготнага крэдыту на будаўніцтва або набыццё жылога памяшкання. Розніцу паміж гэтай велічынёй і рэальным коштам аднаго «квадрата» льготнік кампенсуе за кошт уласных сродкаў або шляхам дадатковай пазыкі па лініі камерцыйнага крэдытавання.

Нагадаю, што сёлета беларускія банкі плануюць выдаць насельніцтву крэдытныя рэсурсы для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў на агульную суму ў памеры 15,802 трлн рублёў, з якіх 14,764 трлн рублёў будуць выдадзены па сістэме льготнага крэдытавання. Цяпер ільготнікаў у краіне крэдытуюць два банкі — Беларусбанк і Белагрупрамбанк. Дарэчы, ільготны крэдыт на жыллёвую нерухомасць, згодна з Указам №13, могуць атрымаць малазабяспечаныя грамадзяне-чаргавікі «са стажам», шматдзетныя і маладыя сем'і, вайскоўцы, чарнобыльцы, інваліды і іншыя сацыяльна неабароненыя катэгорыі грамадзян. У мінулы раз нарматыў жыллёвага «квадрата» для банкаў павялічваўся з 4,6 млн рублёў да 5,3 млн рублёў летась у кастрычніку.

Сяргей КУРКАЧ

■ Учынак

«ЛЁД ХРУСЦЕЎ, А Я ПОЎЗ»

Аляксандр Жолудзеў выратаваў… траіх, але героем сябе не лічыць

Пра тое, што ў Віцебску малады чалавек выратаваў хлопчыка, які мог патануць у рацэ Віцьба, «Звязда» ўжо паведамляла. Нагадаем, што недалёка ад цэнтра горада пяцікласнік, які катаўся на санках з горкі, праваліўся пад лёд на рацэ. Адбылося гэта а чацвёртай гадзіне дня на праспекце Людзнікава ў раёне аўтамабільнага моста «Юбілейны» цераз раку Віцьба. Вучань 5 класа сярэдняй школы № 28 потым растлумачыў, што санкі заехалі на лёд і ён пайшоў іх даставаць. На адлегласці трох метраў ад берага і здарылася бяда.

Выратаваў хлопчыка 21-гадовы жыхар абласнога цэнтра Аляксандр Жолудзеў. Ці разумеў ён, што сам можа патануць? Што адчуваў, калі кінуўся на дапамогу? Аб гэтым і іншым наш карэспандэнт распытаў героя. Што цікава: ён аказаўся… суседам аўтара гэтых радкоў — жыве ў доме на праспекце Людзнікава.

— Так, плаваць я, вядома, умею — другі разрад маю. У школьныя гады запомніліся заняткі па прадмеце «Асновы бяспекі жыцця». Памятаю, як прафесійныя выратавальнікі расказвалі, што трэба рабіць, калі, не дай Бог, нешта здарыцца… Бачыце, спатрэбілася. А ў той дзень выпадкова ўсё адбылося. Я і мой таварыш ішлі па мосце. Раптам пачулі гучныя крыкі аб дапамозе. З моста, з вялікай вышыні ў вадзе я нічога не бачыў, бо ў мяне са зрокам праблемы. Заўважыў спачатку санкі… Мы пабеглі на крык. Хвіліны за тры дабеглі да берага. Я скінуў куртку, абутак, лёг на лёд, дапоўз да палонкі… Калі б ішоў, а не поўз, з маёй вагой 90 кілаграмаў мог бы, напэўна, праваліцца ў ваду. Лёд хрусцеў, а я поўз, — расказвае Аляксандр.

Калі ўжо выцягнуў малога з вады, да месца надзвычайнага здарэння падышлі жанчына і хлопец. Першая зняла з сябе кашулю і надзела на хлопчыка, а малады мужчына даў яму куртку. Апошні і выклікаў выратавальнікаў і «хуткую». Каб сагрэцца, пакуль чакалі прыезду спецыяльных службаў, зайшлі ў будынак аўтазапраўкі. Як расказаў Саша, ён вельмі замерз тады. На «хуткай» хлопчыка павезлі ў бальніцу. А прадстаўнік МНС запісаў імя, прозвішча і адрас выратавальніка.

Папрасіў героя трохі расказаць пра сябе.

— Вучыўся ў віцебскай сярэдняй школе № 3, скончыў ліцэй № 1 па спецыяльнасці «аператар станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем». Паўгода папрацаваў станочнікам на віцебскім заводзе «Эвістар», трохі ахоўнікам — у забаўляльнай установе. Зараз, можна сказаць, шукаю працу па душы. Халасты, — сціпла расказвае хлопец.

Як паведамілі «Звяздзе» ў **Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях,** па добрай традыцыі такіх неабыякавых і смелых людзей, якія прыходзяць на дапамогу іншым, звычайна заахвочваюць. Праўда, Аляксандр не лічыць, што заслужыў чагосьці. Яго больш хвалюе здароўе хлопчыка.

— Я раней яго не ведаў. Толькі ад журналісткі з тэлебачання, якая на наступны дзень гутарыла са мной, даведаўся, што ў хлопчыка па імені Ігар усё добра. А потым у тэлевізійных навінах пачуў, як доктар расказваў, што малога хутка выпішуць. Можа, сёння пад'еду ў бальніцу да Ігарка, пагляджу, як ён.

Напрыканцы размовы хлопец прызнаўся, што… і раней выратоўваў людзей, якія танулі. Летам мінулага года разам з сябрамі выцягнулі з ракі мужчыну. І каля дачы, у вёсцы Межава Аршанскага раёна, дастаў з вады дзяўчыну. Упэўніўшыся, што з гэтымі людзьмі ўсё добра, наш герой сціпла сыходзіў.

Словам, Аляксандр — малайчына! Ён здольны імгненна прымаць правільныя рашэнні і рабіць «звычайныя цуды»!

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

ЭКАНАМІЧНЫ РОСТ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Год гасціннасці, на думку Міхаіла Мясніковіча, неабходна вярнуцца да выканання патрабаванняў Дырэктывы № 4. «Прадпрымальніцтва, развіццё сферы паслуг у гэты год павінны стаць важнейшымі фактарамі эканамічнага росту», — адзначыў ён. Таму тыя заданні, якія ўстаноўлены ў адносінах да мясцовых органаў улады па павелічэнні долі малога і сярэдняга бізнесу ў валавым рэгіянальным прадукце, павінны быць не проста нейкімі пажаданнямі — у гэтым напрамку павінна быць праведзена пэўная работа, перакананы прэм'ер.

Ён са шкадаваннем канстатаваў недастатковасць той падтрымкі, якая цяпер аказваецца мясцовымі органамі ўлады малому і сярэдняму бізнесу. Патэнцыял ёсць значна большы. У сувязі з гэтым віцэ-прэм'еру Пятру Пракаповічу дадзена даручэнне сумесна з бізнес-саюзамі і саветам па развіцці прадпрымальніцтва падрыхтаваць мэтавы разгляд гэтага пытання на пасяджэнні Савета Міністраў. Таксама Міхаіл Мясніковіч паставіў задачу ў бліжэйшы час завяршыць работу па продажы арандатарам арандаваных імі памяшканняў. Больш актыўна павінна весціся і работа па ўключэнні ў абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца або неэфектыўна выкарыстоўваецца. Гэта неабходна рабіць ва ўзаемадзеянні з малым і сярэднім прадпрымальніцтвам.

Асноўны аб'ём дзяржпадтрымкі ў гэтым годзе будзе накіраваны на падтрыманне экспарту і мадэрнізацыю. У сувязі з гэтым прэм'ер яшчэ раз нагадаў, што мадэрнізацыя павінна весціся паўсюль. Пры гэтым акцэнт павінен быць зроблены на эфектыўныя і акупныя праекты.

Усяго на падтрымку прамысловасці сёлета будзе накіравана Br45 трлн ільготных крэдытаў і Br4,8 трлн бюджэтных сродкаў. Вялікая ўвага будзе ўдзелена зніжэнню імпарту (у першую чаргу спажывецкага і прамежкавага). Таксама будзе ўзмоцнена адрасная падтрымка насельніцтва.

Усе пералічаныя напрамкі, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, патрабуюць напружанай работы ўсіх членаў урада, а таксама вертыкалі ўлады.

■ Ну і ну!

Долары — замест рублёў. З банкамата

Калі з дапамогай банкаматаў махляры здымаюць грошы з рахункаў людзей, гэта ўжо даўно не сенсацыя. А вось навіна пра тое, што ў Брэсце памыліўся банкамат і выдаў нашмат больш, чым прасілі, імгненна абляцела ўсе сайты. А брастаўчанцы, якой злашчасны банкамат спрабаваў выдаць валюту, гэта прынесла адны толькі клопаты і папсавала нервы.

Супрацоўніца кампаніі «Санта Брэмар» зайшла ў банкамат «Масква-Мінск», каб зняць зарплату, але замест замоўленых рублёў машына стала выдаваць ёй долары. Наталля прасіла пяць мільёнаў беларускіх рублёў, ёй выдалі 2700 долараў. Яна адразу стала званіць у свой банк, чыёй карткай карыстаецца. Але была нядзеля — ніхто з кліенткай гаварыць не стаў. У панядзелак жанчына пайшла ў міліцыю. Усе разборы, пісьмовае тлумачэнне, іншыя фармальнасці ўжо ў самім банку занялі паўдня. Потым ёй, нарэшце, выдалі патрэбную суму ў беларускіх рублях і забралі валюту, якая сапсавала настрой і выхадны дзень. Бо Наталля адразу пасля наведвання банкамата хацела паехаць у краму, каб купіць даўно нагледжаную рэч. Усё давялося адкласці. Потым у банку жанчыне сказалі, што гэта першы падобны выпадак у іх практыцы. Машына ёсць машына: яна, здараецца, дае збой.

Яна СВЕТАВА

■

■ Першачарговыя задачы

З «праблемнымі» дамамі навесці элементарны парадак

Надзённыя пытанні працы будаўнічага комплексу разгледжаны ўчора ў Гродне на семінары з удзелам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандра ЯКАБСОНА, старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА, кіраўнікоў мясцовых органаў улады і прадпрыемстваў. Дадзены тлумачэнні літаральна па ўсіх элементах арганізацыі будаўнічага працэсу — ад моманту выдзялення зямельнага ўчастка да ўводу аб'ектаў у эксплуатацыю.

Акрамя таго, увазе ўдзельнікаў семінара была прапанавана вялікая выстава з узорамі матэрыялаў, што вырабляюцца на Гродзеншчыне для будаўнічага комплексу.

— Як бачым, у нас сёння ёсць усё, каб будаваць якасна і ў тэрмін, — зазначыў Аляксандр Якабсон.

Але чаго ж не хапае?

Ключавыя праблемы ў цэлым па краіне — зрыў тэрмінаў будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў, недастатковае і нерытмічнае фінансаванне будоўляў па прычыне неўкамплектаванасці ЖБСК, масавая адмова ад будаўніцтва дамоў у саставе кааператываў з-за высокага кошту квадратнага метра, а таксама элементарныя пралікі органаў выканаўчай улады ў выбары падрадчыкаў.

Паводле ацэнкі Аляксандра Якабсона, Гродзеншчына па пытаннях «праблемных» дамоў летась выглядала лепш за іншых. Па стане на пачатак лістапада 2013 г. у вобласці сярод праблемных значыўся 31 дом. Дзякуючы сумесным намаганням органаў мясцовай улады, міжведамаснай рабочай групы па пытаннях працы будаўнічага комплексу і іншых зацікаўленых усе гэтыя дамы да пачатку новага года былі ўведзены ў эксплуатацыю. Аднак у студзені з'явілася 8 новых звышнарматыўных жылых аб'ектаў. Гэтую праблему трэба разглядаць як надзвычайнае здарэнне, і яе вырашэнне павінна стаць першачарговай задачай на першае паўгоддзе, падкрэсліў Аляксандр Якабсон. Мала проста прызначыць тэрміны ўводу праблемных дамоў — неабходна мець дакладны план будаўніцтва па кожным аб'екце, з вызначэннем крыніц фінансавання, размеркаваннем працоўных і матэрыяльных рэсурсаў будаўнічых арганізацый.

Ужо прыняты шэраг указаў, дзе вызначана схема дзеянняў (крок за крокам), каб не дапускаць памылак у будаўніцтве — што датычыцца тэрмінаў, якасці работ, фінансавання, выдзялення зямельных участкаў і г.д. «Правілы гульні», якія раней, магчыма, былі недакладна прапісаны ў шматлікіх нарматыўных актах, сёння аб'яднаны ў некалькі дакументаў — у так званую дарожную карту будаўніцтва. Гэта, лічыць Аляксандр Якабсон, простыя і даступныя рэчы для любога, у тым ліку і маладога спецыяліста: маўляў, глядзі і па пунктах працуй.

У гэтых дакументах дакладна ўказана, чаго не павінна быць у будаўнічым комплексе.

— Не павінна быць выпадковых людзей як у службе заказчыка (будзе адпаведная атэстацыя такіх падраздзяленняў), так і сярод падрадчыкаў — арганізацый, якія прыходзяць на будоўлю, нічога не маючы за душой і ліхаманкава шукаюць сабе рабочую сілу, тэхніку. Не павінна быць выпадковых праекціроўшчыкаў, якія бяруцца за аб'ект, не ведаючы, з якога боку да яго падысці. Трэба навесці жалезны, элементарны парадак у будаўнічым комплексе, на што і накіраваны нарматыўныя дакументы, падпісаныя кіраўніком дзяржавы. І калі гэтыя правілы будуць дакладна выконвацца, то ёсць упэўненасць, што ў далейшым не будзе такой праблемы, як нясвоечасовае будаўніцтва аб'ектаў і іх увод у эксплуатацыю, — зазначыў Аляксандр Якабсон.

Неабходна сачыць за тым, каб фінансаванне было своечасовым і не распылялася па ўсёй наменклатуры, а выдзялялася ў строгай адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай. Важна і тое, што новае будаўніцтва жылля для грамадзян, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый на будаўніцтва альбо набыццё жылых памяшканняў, будзе ажыццяўляцца, як прадугледжана Указам № 215, толькі па дзяржаўным заказе. Такі парадак, на думку Аляксандра Якабсона, павінен, у прынцыпе, выключыць з'яўленне «праблемных» дамоў. Пры гэтым кошт квадратнага метра такога жылля павінен адпавядаць сярэднямесячнай зарплаце ў рэспубліцы з карэкцыяй на ўстаноўлены каэфіцыент. А як укласціся ў такія параметры з нашымі размернымі затратамі — першачарговая задача галіновых міністэрстваў, кіраўнікоў прамысловых і будаўнічых арганізацый.

Яшчэ адна сур'ёзная праблема — розныя злоўжыванні ўдзельнікамі будаўнічай сферы. Толькі летась праваахоўныя структуры выявілі ў гэтай галіне больш за 450 злачынстваў, большасць з якіх звязана з карупцыйнымі праявамі, выкарыстаннем ілжэструктур з мэтай уходу ад падаткаў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА № 0491845, № 0439627, № 0439628 **считать недействительными.** УНП 100964704

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту ««Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13,14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко». 2-я очередь строительства. Жилой дом № 12 по генплану»,

опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года»

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БелБизнесРесурс», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 15 декабря 2006 г. № 2548 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190782901.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, кабинет 6.

Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц в жилом доме № 12 по ГП:

2-, 3-комнатные квартиры – при оплате в рассрочку 1450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1350 (Одна тысяча триста пятьдесят) долларов США.

4-комнатные квартиры (2-уровневые от 138 м^2) в рассрочку 1300 (одна тысяча триста) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1250 (Одна тысяча двести пятьдесят) долларов США.

УНП 190782901